Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 8 (507). Вільня, Нядзеля 19 Лютага 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Клічам да цьвярозасьці.

(З прычыны Міжнароднага Тыдня Цьвярозасьці: ад 2—9.II.33).

П'янства — вялікі вораг людзей. Сьветлыя людзі гэта даўно пазналі й павялі з п'янствам самае рашучае змаганьне. У розных краёх Эўропы паўсталі розныя арганізацыі, якія галоўнай, а часта й выключнай сваей мэтай маюць змаганьне з п'янствам. Змагаючца яны з гэтай зморай чалавецтва рознымі спосабамі: выдаюць адпаведныя газэты і кніжкі, ладзяць публічныя лекцыі, навукова выказваючы шкоднасьць п'янства, арганізуюць таварыствы цьвярозасьці і ўсякімі іншымі спосабамі вядуць змаганьне з ужываньнем і асабліва з надужываньнем розных дурманячых, так зв. алькоголічных напіткаў. У выніку пляновай, арганізованай барацьбы за цьвярозасьць многія народы даканалі сапраўды шмат для свайго дабра маральнага і матэр'яльнага.

У нас беларусаў апошнім часам п'янства прымае проста страшныя размеры. Вёска наша, ня гледзячы на так цяжкія часы, запіваецца, як ніколі. Тымчасам няма ў беларусаў ніякіх арганізацыяў дзеля барацьбы з п'янствам і не вядзецца з ім ніякага змаганьня. Даўней змагалася з гэтай зморай наша духавенства, асабліва каталіцкае, а цяпер яно бадай выключна аддалося працы польскай палітыкі: закладаньню гуртмоў S.M.P. (Stowarzyszenie Młodzieży Polskiej), а аб пляновым змаганьні з найбольшым духовым ворагам яго прыхаджан, з алькаголем, і ня думае, або думае надта мала.

П'янства — гэта налоґ, прывычка. Чалавек можа мець і часта мае розныя, часам дужа шкодныя, налогі-прывычкі. Даходзіць ён да іх, у пару з імі не змагаючыся, а наадварот — паволі да іх прывыкаючы. А ўжо як чалавек да чаго, хоць-бы дужа для сябе й шкоднага, прывыкне, тады гэнае злое выкараніць нялёгка, а часта і цалком немагчыма.

Да п'янства чалавек даходзіць праз частае ўжываньне, а прадусім праз надужываньне сьпіртных, алькагольных напіткаў. П'янства — гэта ёсьць сталая, сільная ахвота ў чалавека піць гэтыя напіткі, піць шмат і поўнае часта бязсільле адмовіць сабе ўжыцьця іх.

Да п'янства даводзяць усякія напіткі, што маюць у сабе такую дурманячую атруту, што завецца алькаголь. Ад колькасьці ў якім напітку алькаголю залежа моц гэнага напітку. І так у гарэлцы алькаголю бывае звычайна ад 30 да 60 працэнтаў, у піве — ад 2 да 8%, у віне — ад 10 да 24%. Вось-жа гэты алькаголь, як вуча нас навука, гэта атрута, якая звычайна шкодзіць нашаму здароўю й ад якой нават памерці можна, калі надмерна праглынуць яе. Навука нам кажа, што толькі паўкілішка водкі здароўю нашаму ня шкодзіць, а больш гэтай меры шкодзіць заўсёды.

Людзі адны больш, другія і енш, адны радзей, другія часьцей ужываюць алькагольных напіткаў, тлумачачы гэта сабе карысьцяй алькаголю для здароўя, асабліва для апэтыту, патрэбай часам сагрэцца, а так-жа тым, што алькаголь быццам дае чалавеку магчымасьць павесяліцца й забыцца аб яго горы й аб шэрым, няпрыветным часта, штодзенным жыцьці.

Але гэта ўсё няпраўда. Гэтак гавораць або людзі цёмныя, нясьведамыя справы, або людзі, якія ўжо маюць прывычку п'янства, якія адмовіць сабе алькаголю ўжо проста ня могуць. Як мы ўжо сказалі, алькаголь — гэта атрута й што ўжываньне гарэлкі больш як паўкілішка шкодзіць нашаму здароўю. А калі-ж алькаголь і пабуджае наш апэтыт і мы пад яго дзеяньнем больш ямо, як звычайна, дык гэтым так-жа шкодзім свайму здароўю, надмерна абцяжваючы свой арганізм лішняй ежай. Ашуквае нас так-жа алькаголь і цяплом сваім. Праўда, алькаголь дастаючыся ў кроў нашу прысьпяшае бег яе, расшырае нашы кроўныя жылы і выклікае большую, як звычайна, цеплату. Але цеплата гэта выходзіць на паверхню нашага цела, хутка гіне і цела наша хутка ахаладжаецца. Дзеля гэтага ў п'янога цеплата цела звычайна нізкая і ён хутка мерзьне. Абманная такжа і гэна вясёласьць, якую нам прыносіць алькаголь. П'яны робіцца вясёлым затым, што алькаголь-атрута яго адурманьвае, прытупляе і зацямняе яго розум і толькі гэткім коштам дае нам забыцьцё і гэную вясёласьць. Працьвярэзіўшыся-ж чалавек узноў бачыць тое-ж самае гаротнае сваё жыцьцё, а сябе ён бача іншым — ён астаецца з разьбітай і як-бы паменшанай і абакрадзенай душой. А калі да гэтага дадамо ўсе тыя выдаткі, якія пажырае алькаголь і ўсе тыя праступныя, нягодныя, часта проста агідлыя чыны, якіх чалавек дапускаецца, затруўшыся і адурманіўшыся алькаголем і калі возьмем пад увагу ўсе тыя няшчасьці асабістыя, сямейныя і грамадзкія, беспасрэдным прычынай якіх зьяўляецца той жа алькаголь, дык будзем мець больш-менш цэлы абраз тых «дабрадзействаў», якія алькаголь гэты нам прыносіць.

Тымчасам, ня гледзячы на ўсё сказанае і на так цяжкія варункі жыцьця, людзі алькаголю сабе не шкадуюць. Вось што аб гэтым гавораць лічбы. Жыхары ўсей Польшчы, а ў іх ліку і Беларусы за 1931 год прапілі каля 800 мільёнаў залатоваў. Выходзіць, што кожны грамадзянін Польшчы (800 мільёнаў падзеляныя на 32 мільёны насельніцтва) прапівае ў год 25 залатовак, а сям'я, дзе ёсьць прынамсі 4 асобы. прапівае (25×4) 100 залатовак у год. Колькі-ж за гэтыя грошы ў нас можна было-б залатаць дзюраў у гаспадарцы і колькі памагчы беларускаму выдавецтву кніжак, газэт, агулам беларускай народнай справе?!

Даражэйню гарэлкі скарбовай жыхары Польшчы, а ў іх ліку і беларусы, стараюцца абыходзіць самагонкай. За той-жа 1931 год ува ўсей Польшчы выкрыта 1232 тайных браварком самагону, а за першую чверць мінулага 1932 г. такіх браваркоў выкрыта ўжо аж 2273! Беларусы, ведама, ў гэтым «промысьле» займаюць „пачэснае" мейсца. Тымчасам „майстры" ўжо сядзяць бяз хлеба і на вясну ня будуць мець чым абсеецца.—А аб усей шкоднасьці гэтага „рамясла" для жыцьця духовага народу — і не ўспамінаем!

Канчаючы, заклікаем Беларусаў апамятацца, пачаць самую рашучую барацьбу з п'янствам і цьвёрдай нагой стаць на шлях цьвярозасьці. Памятаймо, што п'янства — найбольшы вораг наш — як адзінак і як народу. Мы добра знаем, што ніхто нам ня спрыяе, ніхто ня рупіцца аб дабро наша, дык самі працуйма над сабой, над цьвярозасьцяй сваей.

Хто да 25 лютага с. г. прышле 4 зл на „Бел. Крыніцу", той дарма дастане прэмію з 22 цэнных кніжак. Карыстайце!

15-лецьце Літоўскай Незалежнасьці.

(16.II 1918—16.II.1933).

Дзень 16 лютага кожнага году гэта дзень Літоўскай Незалежнасьці, дзень літоўскага народнага сьвята. Сёлета ў гэты дзень мінула ўжо пятнаццаць гадоў ад таго часу, калі Літоўцы аб'явілі Літву незалежнай дзяржавай, прыступілі да барацьбы з ворагамі яе і хутка гэтую незалежнасьць, хоць не па ўсіх яшчэ землях, здабылі і ўцьвярдзілі.

Барацьбу за палітычную вольнасьць сваей бацькаўшчыны Літоўцы пачалі значна раней. У 1905 г., карыстаючы з рэвалюцыйных у Расеі замешак, яны склікалі ў Вільню вялікі зьезд прадстаўнікоў з усей Літвы дзеля нарады над яе лёсам. Зьезд гэты Літоўцы завуць Вялікім Соймам. Сойм гэты, між іншымі пастановамі, пастанавіў так-жа дамагацца ад расейскага цара аўтаноміі для Літвы. Пасьля гэтага ўся Літва як-бы абудзілася да новага жыцьця; усюды Літоўцы грамадзкае жыцьцё ў сваім краі пачалі браць у свае рукі. Пасьля Вялікага Сойму Літоўцы Расейцаў і іх мову выганялі із школы, з гміны і з розных іншых грамадзкіх установаў, заступаючы іх сваімі людзьмі і ўсюды ўводзячы сваю мову.

Праўда, калі царскія ўлады рэвалюцыйны рух здушылі, у Літве ўзноў завялі старыя парадкі, але тое, што Літоўцы пасьпелі тады зрабіць, мела для іх вялікае значэньне. Вялікі Сойм у Вільні сапраўды разбудзіў палітычна літоўскі народ і паставіў яго на шлях самастойнасьці, з якога ён ужо ня зышоў ніколі.

Прышла сусьветная вайна. Літва сталася полем бітвы маскоўскіх і нямецкіх войск. Вайна гэта, як ведама, прынесла ўрэшце сьмерць царызму нямецкаму і расейскаму, а ўскрашэньне Літве.

У 1917 г., ў жніўні, ў тэй-жа Вільні адбылася конфэрэнцыя Літоўцаў, на якую з усей Літвы прыбыло 214 прадстаўнікоў. Конфэрэнцыя гэта пастанавіла змагацца ўжо не за аўтаномію, а за поўную незалежнасьць і дзеля гэтай мэты выбрала Раду Літвы (Lietuvos Taryba), лікам 20 чалавек.

Вось-жа гэта Рада Літвы 16.II.1918 г. аб'явіла Літву незалежнай і ад гэтага часу пачала звацца Літоўскай Дзяржаўнай Радай. У Дзяржаўную Раду, на падставе дагавору яе з Віленскай Беларускай Радай, увайшлі так-жа прадстаўнікі і ад Беларусаў: В. Ластоўскі, Ів. Луцкевіч, Кс. Ул. Талочка і інш. У тым-жа яшчэ 1918 г. Дзярж. Рада апрацавала і аб'явіла пункты тымчасовай конституцыі і 11.XI.1918 г. арганізавала першы літоўскі ўрад, у якім быў так-жа міністр беларускіх спраў.

Военная польска-бальшавіцкая завяруха ў 1919 г. змусіла літоўскую дзяржаўную ўладу з Вільні пераехаць у Коўну, дзе 15.V.1920 г. быў скліканы Літоўскі Устаноўчы Сойм, які й пачаў ужо нармальнае будаўніцтва незалежнай Літвы.

Імкненьне аднак да сваей незалежнасьці пачуў літоўскі народ і выявіў 16 лютага 1918 г. Дык ня дзіва, што дзень гэты ўся Літва сьвяткуе, як сваё вялікае народнае сьвята.

Віленскае літоўскае грамадзянства дзень гэты сёлета адзначыла набажэнствам раніцы і ўрачыстай акадэміяй—увечары.

Ад Беларусаў віталі Літоўцаў з днём іх вялікага сьвята старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту рэд. Я. Пазьняк і прадстаўнік Бел. Студэнскага Саюзу — С. Сарока.

М. К.

З беларускага жыцьця.

Урачыстае сьвяткаваньне 300-лецьця сьмерці Льва Сапегі. Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы пры У. С. Б. ў Вільні ладзіць дня 26 лютага с. г. (у нядзелю) у V залі Унівэрсытэту а гадз. 17-ай **Урачыстую Навуковую Зборку,** прысьвячаную 300-летнім угодкам сьмерці канцлера Вялікага Княства Літоўскага — Льва Сапегі. Парадак дня зборкі наступны:

І. Лекцыя **д-ра Я. Станкевіча** на тэму: **„Гаспадарственнасьць Вялікага Княства Літоўскага".**

ІІ. Лекцыя **магістра М. Шкялёнка** на тэму: **„Леў Сапега — Канцлер Вялікага Княства Літоўскага".**

Уваход вольны. Асабістыя запросіны рассылацца ня будуць.

Водгукі арыштаў у Навагрaдку. У дапаўненьне нашай весткі аб арыштах вучняў і вучаніц Навагрaдзкай беларускай гімназіі даведваемся, што лік пачаткава арыштаваных сягаў 9-цёх асоб. З гэтага 4 асобы ўжо звольненыя. Малая, мусіць, была ад іх „пагроза" для публічнай бясьпечнасьці. Спадзяемся, што ня большай акажацца гэта „пагроза" і ў затрыманых яшчэ ў арышце. — Але-ж такі ўжо лёс для беларуса, што ў сваей падарожы да вольнасьці і самабытнасьці мусіць прайсьці „праз„ агонь, ваду і медныя трубы".

Агульны Сход сяброў Віл. Аддзелу БІГіК. адбудзецца ў суботу 25 лютага а гадзіне 18-ай у памешканьні ўласным (вул. Людвісарская 1—19). — У разе нястачы кворума, сход праз гадзіну, г. зн. а гадз. 19-ай будзе важны пры ўсякім ліку сябраў. — Напамінаецца пры гэтым, што кожны сябра Аддзелу мусіць мець з сабой сяброўскі білет.

З выдавецкае нівы. Гэтымі днямі выйшаў чарговы № 2 беларускай праваслаўнай часопісі „Царква і Народ". Зьмест часопісі: „Пастанова Сьв. Сыноду", верш „Я веру", „Элеўфэрыянства і наша будучыня", „Хрысьціянства на Беларусі" (популярны гістарычны нарыс), „Бязбожнік", „Трэба...", „Хроніка", „Голас Народу" і „Пошта" — адказы рэдакцыі. Адрэс рэдакцыі: Вільня, вул. Баровая 7—1.

«Chryścijanskaja Dumka» № 2 — беларуская каталіцкая месячная часопісь. Зьмест багаты і цікавы. Часопісь гэна выходзіць ужо 5 год стала і акуратна. Адрэс рэдакцыі: Вільня, зав. сьв. Мікалая 8—3.

Гэткай угодлівасьці яшчэ Беларусы ня бачылі. Навуковае Т-ва беларускіх полёнофілаў у Вільні на чале з Ант. Луцкевічам выдае гадавік. Паводле чутага карэкта гэтага гадавіка пасылаецца ў Ваяводзтва для перагляду, каб ня было там чаго „nieprawomyślnego". Ну, такога цеснага супрацоўніцтва з адміністрацыйнай уладай яшчэ ў Беларусаў ня было. Папярэднія „нашы" полёнофілы да гэткай угодлівасьці не даходзілі!

Эванэліі пабеларуску. „Chr. Dumka" паведамляе, што Кс. В. Гадлеўскі пераклаў на беларускую мову чатыры Эванэліі і далей працуе над перакладам усяго Новага Тэстамэнту. Першая Эванэлія ўжо аддадзена ў духоўную цэнзуру. Незадоўга туды-ж будуць здадзеныя апошнія тры Эванэліі і ўсе іншыя кнігі Новага Тэстамэнту.

Нядаўнае беларускае тлумачэньне гэтых кніг, выдадзенае мэтадыстамі, мае пахібы догматычныя, шмат нясьціслaсьцяў як што да сэнсу, так і беларускай мовы. Эванэліі ў беларускім перакладзе ведамага беларускага дзеяча, магістра тэолёгіі Кс. В. Гадлеўскага будуць такім чынам першым беларускім выданьнем гэтых сьвяшчэнных кніг з духоўнай (касьцельнай) апробатай.

Толькі як доўга прыдзецца на яе чакаць?

Голас беларуса ў польскім Сойме. Дня 4 г. м. пас. Ярэміч на агульным паседжаньні польскага Сойму ў прамове з'ілюстраваў палажэньне беларускага народу пад Польшчай, дзе заведзены надзвычайныя (даразныя) суды, а беларускае жыцьцё культурна-прасьветнае і агулам грамадзкае падпарадкавана польскай адміністрацыі.

Адміністрацыя „Беларускай Крыніцы" паведамляе, што з віны самых падпішчыкаў верненыя прэміі (кніжкі) ня могуць быць паўторна высыланы сваім адрэсатам датуль, покуль яны ня прышлюць коштаў апакоўкі і перасылкі ў абодва бакі (1 зл. 60 гр).

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Бальшавікі процiў Беларусаў. Газэты паведамляюць, што з Беларускай Акадэміі Навук у Менску звольнены прафэсары: Рыгор Міхневіч і Пётра Тымахоўскі і 11 студэнтаў за тое быццам, што яны „вялі сярод моладзі нацыяналістычную (чытай: беларускую) працу". — Звольненым выданы „воўчыя білеты" і іх ужо ніякая ўстанова ў Саветах ня можа прыняць да сябе на працу.

Лёс беларуса сягоньня ўсюды аднолькавы.

Чужацкая колёнізацыя. Газэты падаюць, што цэнтральныя савецкія ўлады пастанавілі ўзмоцніць чужацкую колёнізацыю ў Радавай Беларусі.

У палавіне г. м. мела прыбыць у Менск спэцыяльная дэлегацыя з цэнтру С. С. Р. Р. дзеля апрацоўкі пляну новай колёнізацыі. Дэлегаты гэтыя будуць аб'яжджаць усе раёны, каб даведацца колькі і каго куды прыслаць. Прадусім для новай колёнізацыі вызначаны раёны: Дрыскі, Богінскі, Кашырскі, Заслаўскі і Койданаўскі. Вясной у гэтыя раёны маюцца прывезьці з глыбіні Расеі 10 тысяч асоб. У Дрыскі раён маюць прыслаць 1.600 асоб зпад Волгі, у Богінскі раён —1.400 камуністаў з Саратаўскага вокругу, Кашырскі раён мае быць населены камуністамі-палякамі з Кіеўскага і Маскоўскага вокругаў, а ў Заслаўскі і Койданаўскі раёны будуць насяляць б. чыноўнікаў бальшавіцкай ахранкі (Г.П.У.) і расейскіх б. ваяноў бальшавіцка-польскай вайны.

Як бачым, асадніцтва і колёнізацыя ў Радавай Беларусі ня спыняецца, але яшчэ пашыраецца. Беларускі селянін пад камуністычным валаданьнем згубіў ня толькі зямельку, на якой працавалі яго продкі і ён, але мусіць разьвітывацца і з родным краем, бо зямлю беларускаму селяніну бальшавікі даюць аж у Сібіры, а на яго месца прысылаюць людзей з Расеі. Эх, ты доля Беларуса!

З украінскага жыцьця.

Процiў алькаголю. Украінскае процiалькагольнае Т-ва „Адраджэньне", якое мае больш 100 гурткоў, абвесьціла сёлетні м-ц люты месяцам барацьбы з алькаголем. З гэтай мэтай сарганізаваны процiалькагольныя і процінікотынныя (процітабачныя) сьвяты, курсы, рэфэраты, выданы адпаведныя брашуры і плякаты, у якіх скрось паказваецца як сьпірт і табака нішчаць чалавека маральна і матэрыяльна, аслабляюць волю, ломяць характар, руйнуюць фізычную спраўнасьць і здольнасьці памяці, спрычыняюць дэгенэрацыю і выміраньне цэлых народаў. — Каб усяго гэтага ўсьцерагчыся, прапагуецца ўстрымлівасьць ад піцьця водкі (цьвярозасьць) і курэньня табакі, паказваючы адначасна, як водка і табака прыводзяць да жабрацкай торбы ўкраінскае сялянства і ўзбагачваюць незаслужона ягоных праціўнікаў.

Час-бы быў аб гэтым падумаць і сялянству беларускаму, бо і ў яго ня менш праціўнікаў, якія таксама стараюцца яго адпаведна „намачыць" (водкай) і „абкадзіць" (табачным дымам), каб пасьля лягчэй было з адурманенага цягнуць апошнія сокі.

В.

J. Bylina.

MACIEJ. (4)

Dumaŭ tut Maciej adzin
Dy chadziŭ siudy tudy
Tak praz niekalki hadzin:
„Piotra hdzieś nažyŭ biady:
Daj da bramy pabiahu,
Moža ja čym pamahu".

Tak Maciej naš razwažaje
Dy i šahu padbaŭlaje.
Bačyć, Piotra u chłapocie,
Chutka biehaje u pocie.
„Ach, Maciejka, moj Maciej,
Woś chadzi siudy chutčej,
Pamažy mnie u biadzie:
Kluč prapaŭ, nia znaju hdzie?
Bo tut baby nadta redka
Papadajucca da raju,
Dyk nia časta admykaju
Tuju bramu.Boh mnie świedkam.
Jak nia daść Maciej ŭ dałoni:
„Dyk šukaje chaj Antoni,
Jon światy da hetych spraŭ:
Ci ukraŭ chto, ci prapaŭ,
Jon na hetta užo sprytny,
Dy i wielmi jość ambitny;
Kožna sprawa udajecca".
Piotra słuchaje, śmiajecca.
Ŭ momant tut Anton źjawiŭsia,
Jak jon heta nia kruciŭsia,
A kluča dyk nie znajšoŭ.
„Peŭnie, bolej sta hadoŭ
Jak jaho ŭ rukach trymali,
Bo złodziei tut nia krali
I prapaści jon nia moh.
Music kluč uziaŭ sam Boh.
Dyk paradźsia Tamaša,
Ci žanockaja duša
Moža jści, hdzie jduć mužčyny?"

Tak Antoni daje radu
I złažyŭšy ruki z-zadu,
Źniknuŭ im u tu' chwilinu.
Tamaša tam pawažali —
Adwakataŭ takich mała,
Kab tak prawa jany znali,
Ŭsiaki sprečki tam bywała
Mudraj radaj jon raźwiaža.

Dyk źjawiŭšysia, tak kaža:
Sprawa tut susim nia štučna,
Kožna prawa jość wyklučna,
Raz adzin dyk heta možna,
Tolki treba aściarožna".

Što skazać, to mudra rada
Pajšła hładka, jak pamada.
Piotra rad na hety słowy,
Kluč uziaŭšy, byŭ hatowy,
Mužsku bramu adčyniać,
Staŭ Tamaša pierš pytać:
„Ci nia lepiej budzie heta,
Kab duša taje kabiety
Tut pry świedkach chaj idzieć,
Kab pašla nia znać turbotaŭ,
Ci jakich jašče chłapotaŭ
Nia pryšłosia mnie ciarpieć"?
„Nie zaškodzić zrabić tak,
Mnoha świedkaŭ lubić sprawa,
Jak zahonščykaŭ abława."
Nu j na słowy jon mastak,
Tak padumaŭ naš Maciej
I čakaje, što dalej.

Jak dawiedaliś mužčyny,
Što ich bramu dla žančyny
Piotra budzie adčyniać —
Nie prašło i chwilin piać,
Jak zyšłasia hramada,
Bolš, čym zierniat u zasieku,
Roznych „wozrastaŭ" i wieku.
Kožny choča pahladzieć,
Ci žančyna małada.
Tolki brama zaskrypieła,
U kožnym serca zadryžeła:
„Hlańcie, hlańcie, wun idzieć".
Pacisnuŭsia i Maciej,
Kab la bramy być bližej,
Až hladzić jon: što-ž tut heta?
Tož znajomaja kabieta!
Widzić woblik jon žany.
Wot spatkaliś hdzie jany:
Pad im nohi zadryželi.
Až biažyć—usia ŭ bieli
Miła žonačka Maryla,
Byccam skačučy kadryla,
A tak złosna, jak źmiaja:
Jak nia ŭbačyć Macieja,
Jak nia schopić dobry prut:
„Ach, ty šelma, i ty tut!"
Dy i rynułaś na muža,
(A była Maryla duža,)
Čyścić mužu daj baki.
Jon nia wydzieržaŭ taki,
Dy zwaliŭsia biedny z noh.
Sumatocha, što kryj Boh,
Tam u rai padniałasia.
„Pazawiecie mnie Michasia,
Chaj jon babu mnie z wačej
Z raju wyhanić chutčej"—
Swiaty Piotra zakryčaŭ
I čuć drapu sam nia daŭ,
Kab nia mieć jakoj biady.
Usie światyja, chto kudy,
Uciakali piarunom.
Wot Michał idzieć z miačom:
„Što takoje?" — staŭ pytać,—
„Treba babu tu' prahnać",—
Światy Piotra tak haworyć,
A sam blizka nie padchodzić.
„Wyhnaŭ čorta ŭ piekła z raju,
Dyk i babu, heta znaju,
Proč adhetul pražanieš."
„Ach, moj Piotra, najmilejšy,
Z babaj sprawa jość trudniejša,
Choć na pomač pazawieš
Z nieba całyja pałki —
Nie biarusia ja taki
Henaj baby prahaniać:
Elijaša treba zwać.
Moža jon jak u karetu
Zamanieć čym babu hetu".
Elijaš u mih pryšoŭ,
Sposab nowy jon znašoŭ.
„Ja stary i łysawat —
Słaba ŭžo z mianie prymanka.
Ach, moj lokaj dobry chwat!
Jak maja siudy furmanka
Ŭžo padojdzie, dyk ja z-zadu
Sam za lokaja tam siadu,
A pryhožańka adziety,
Lokaj siadzić u karetu:
Chaj da baby padmirhnieć,
Da siabie tak padmanieć,
Chutka dźwiery u karecie
Zamykajcie najkrapčej.
Dyj rabiecie ŭsio ŭ sakrecie".

(d. b.)

З Польшчы.

З Сойму. Работа ў сойме над дзяржаўным бюджэтам падходзіць да канца. Як грамадзяне дзяржавы будуць несьці бюджэтны цяжар, соймавая большасьць шмат не задумываецца: робіць сваё і баста.

Соймавая меншасьць: — паслы — непалякі, правіца і лявіца — ў дыскусіі над гэтым бюджэтам востра крытыкавала міністраў за іх дзейнасьць і дзейнасьць падуладнай ім адміністрацыі, але гэная крытыка так і асталася толькі крытыкай.

Падчас дыскусіі над бюджэтам міністэрства справядлівасьці, калі мін. Міхалоўскі ўзышоў на трыбуну, уся апазыцыя: правіца і лявіца, а так-жа і народныя меншасьці, дэманстрацыйна выйшлі з залі нарадаў. Асталіся толькі паслы ўрадавага Б. Б. Міністр Міхалоўскі прад імі сказаў прамову, у якой зазначыў, што новы кадэкс карны мае вялікае значэньне, бо цяпер і ва ўсіх дзяржавах узмацняецца кара за проціўдзяржаўныя праступкі. Як прыклад паказаў на ССРР., Гішпанію і фашыстаўскую Італію. — Добрыя прыклады, „няма чаго» стыдацца.

Прысуд у Апэляцыйным судзе б. берасьцейскіх вязьняў. Варшаўскі Апэляцыйны суд дня 11 г. м. абвясьціў свой прысуд, якім пацьвердзіў засуд Акружнога суду і пашырыў кару засуджаным, пазбаўляючы іх грамадзкіх правоў: Вітаса, Багінскага, Барліцкага, Лібэрмана і Керніка на 3 гады, а Мастэка, Дюбуа, Ціолкоша і Путэка на 5 гадоў.

Акружны суд засудзіў іх ад 3-ох да паўтара году вастрогу без пазбаўленьня правоў.

У Польшчы мае быць больш грошай. Польскі Банк хоча пабольшыць абег грошаў мэталёвых і папяровых. Дасюлешняе пакрыцьцё золатам, што выносіць 40 проц., мае быць абніжана да 30 проц.

Апрача гэтага Банк хоча расьпісаць дзяржаўную пазычку, каб ёй пакрыць леташні дзяржаўны недабор Як гэта ўсё паможа гаспадарчаму жыцьцю ў дзяржаве, пабачым.

Чарговы суд над украінцамі. У Львове пачаўся гэтымі днямі суд над 18 украінцамі. Абвінавачваюць іх за прыналежнасьць да украінскай ваеннай арганізацыі і за пашырэньне проціўдзяржаўнай літэратуры. Працэс гэны зьяўляецца як-бы прадаўжэньне справы — працэсу Біласа і Данілышына. Суд гэны працягнецца некалькі дзён.

Арышты сярод украінцаў. Польскія газэты пішуць, што ў Драгабычу паліцыя арыштавала многа ўкраінцаў. Найбольш арыштавана ў Драгабычу, Барыславі і Трускаўцу.

З заграніцы.

У Нямеччыне Гітлер узяўся за работу. Яшчэ нядаўна Гітлер дайшоў да ўлады, а ўжо ворагаў сабе нажыў нямала. У першую чаргу ён востра супроць сябе паставіў даволі моцную ў Нямеччыне партыю камуністычную, супроць якой застасаваў жорсткія рэпрэсіі. Не ласкавы да Гітлера і іншыя партыі, з каторымі Гітлер ня лічыцца, бо ён апіраецца толькі на сваю партыю, праз каторую хоча ахапіць увесь нямецкі народ.

Гітлер проціў камуністаў выступіў адкрыта, жорстка і здзэцыдавана. Ён заявіў, што камуністычная партыя ў Нямеччыне будзе забаронена, а марксаўская тэорэтычная ідэолёгія агулам праз 10 гадоў мусіць быць выкаранена з народу, бо яна фальшывая і згубная.

Гітлер аб разбраеньні і Вэрсальскім дагаворы. Дзеля апублікаваньня ў газэтах Гітлер выказаў свае пагляды на разбраеньне і Вэрсальскі трактат прад прадстаўніком ангельскай газэты „Сандэй Экспрэс". Між іншым ён заявіў, што першым заданьнем Нямеччыны і ўсяго сьвету ёсьць разбраеньне і яно мусіць быць уступам да міру і дабрабыту. Але разбраеньне мусіць быць на чэсных і роўных асновах. Або Францыя разброіцца так як Нямеччына, або Нямеччына мусіць стануць на аднолькавай з Францыяй роўні. Вэрсальскі трактат аказаўся няшчасьцем ня толькі для Нямеччыны, але і для іншых дзяржаў. Нямеччына мусіць дамагацца рэвізіі гэтага трактату. Незадоўга і рэшта сьвету будзе дамагацца рэвізіі яго. Маё становішча, заявіў Гітлер, будзе прымірымае ў кожнай справе, але Францыя мусіць зразумець, што варункі, на якіх накінуты мір, ужо неадпаведныя і немагчымая. Рэвізія трактату тым больш канешная, што Францыя ўсё зброіцца.

Другой несправядлівасьцяй, заявіў Гітлер, зьяўляецца „польскі калідор." Цяперашняе палажэньне ненавідзіць уся Нямеччына. „Польскі калідор" мусяць вярнуць Нямеччыне. Нічога няма каб Нямеччына так балюча адчувала, як несправедлівасьць „польскага калідору." Гэная справа мусіць быць скора залагоджана.

Што да колёніяў, дык Нямеччына ніколі не зрачэцца сваіх колёніяльных правоў, бо мае гэнае права, як і ўсе іншыя дзяржавы.

Быўшы кайзэр ня вернецца. Гітлер заявіў, што аб павароце Кайзэра (імпэратара) ў Нямеччыну няма і гутаркі.

Страшная катастрофа. У Нямеччыне ў Нойкірхэн, у басене Сары, дня 10 г. м. ўзарваўся зборнік газу 120.000 куб. мэтр. Узрыў быў такі сільны, што пашкодзіў нават у далёкіх ваколіцах. Ахвяр людзкіх налічваюць каля 200 асоб. Завалілася каля 50 дамоў. Чыгуначныя лініі ўшкоджаны. На вакзале ў Нойкірхэн вылецелі ўсе шыбы з вакон і многа ранілі людзей.

Румыніі гразіць рэвалюцыя. Работнікі ў Румыніі пачалі масава баставаць, бо ім па паўгоду ня плацяць за работу. Шпіонаў там поўна, за грошы йдуць на ўсё. У парляманце паслы так сварацца, што даходзіць да бойкаў. Адзін пасол хацеў біць па твары міністра. У такім напружаньні парлямант пацьвердзіў новы закон, як і паставіў дзяржаву на ваенным палажэньні, бо, як заявіў старшыня міністраў, дзяржава мусіць бараніцца прад небясьпекай бальшавіцкай рэвалюцыі.

Паўстаньне ў Сібіры. Газэты падаюць, што ў Сібіры выбухла паўстаньне проціў бальшавікоў. З Іркуцка бальшавікі выслалі проціў паўстанцаў многа войска. Між Чытой і Іркуцкам усе важнейшыя мяйсцовасьці абсаджаны чырвонаармейцамі. У апошнія часы паўстанцы паявіліся ў районе Краснаярскім і Каньскім, дзе да паўстанцаў далучылася і войска.

Паводле ўрадавых бальшавіцкіх вестак, паўстанцаў налічваецца каля 40 тысяч. Паўстанцы паявіліся ўжо і каля Томска, дзе захапілі цягнік з аружжам і амуніцыяй. У Барнаульску паўстанцы напалі на дзяржаўны банк, забілі некалькі ўрадаўцаў і забралі 26 мільёнаў рублёў.

Паводле дагадак савецкіх кругоў, паўстаньнем на Сібіры кіруе чужая рука (дагадка на японцаў). Гэныя дагадкі пацьвярджаюць факты, што паўстаньне выбухла пераважна ў вокругах гранічачых з паласой японскіх уплываў і ў часе завастрэньня адносін між Саветамі і Японіяй.

Польшч проціў Францыі. Нядаўна ў Жэнэве, на паседжаньні камісіі дзеля разбраеньня, польскі прадстаўнік выступіў проціў францускага праекту. Зрабіў ён гэта затым, што Польшч апошнім часам, жадаючы зьбліжэньня з Нямеччынай, хоча паказацца, што яна самадзейная і на паводку Францыі ня ходзіць.

Зьмены ў Латвіі. У Латвіі апошнім часам быў урад, які за галоўнае заданьне ўважаў нішчыць школы нацыянальных меншасьцяў: Беларусоў, Расейцаў і інш. Вось-жа, нядаўна ўрад гэты, не атрымаўшы апрабаты для сваіх плянаў у Сойме, быў змушаны падацца ў адстаўку. Дай Божа, каб новы быў лепшы!

—::—

Спосаб проціў гаспадарчага крызысу. У Амэрыцы прыгатавалі закон, які мае супроць ставіцца гаспадарчаму крызысу. Гэты закон мае прадусім зарганізаваць сялянства ў картэль — Сялянскае Аб'яднаньне. Хто з сялян увойдзе ў гэты саюз і згодзіцца засяваць поле на 20 процантаў менш, таму дзяржава, апрача звычайнай рынковай цаны, будзе даплачываць за яго збожжа і іншыя прадукты яшчэ гэтулькі. Дзяржава спадзяецца, што ўсе сяляне ў гэты саюз увойдуць і згодзяцца менш засяваць поля, дык тады ня будзе лішняга збожжа, а толькі гэтулькі, колькі яго трэба і цана збожжа падымецца так, што будзе аплачывацца сялянству яго продукцыя. Тады дзяржава перастане сялянству даплачываць да рынковай цаны, сялянства збагацее, пачне купляць фабрычныя вырабы і кончыцца крызыс.

З польскага Сібіру.

Сапраўдны Сібір для царскай і бальшавіцкай Расеі быў і ёсьць краінай кары і колёнізацыі. Туды ссылаліся і ссылаюцца дзяржаўныя праступнікі і пасылаліся ды пасылаюцца з Расеі колёністы.

Польшч шмат чаго запазычыла з спадчыны царскай Расеі, але не хапае ёй такой краіны, як Сібір. Колёністаў сваіх (польскае вайсковае асадніцтва) Польшч сьпярша высылала ў Зах. Беларусь, але дзяржаўных праступнікаў высылаць ня мае куды. — Словам, чым для Расеі зьяўляецца Сібір, тым для Польшчы, да пэўнай меры, паслужылі нашыя землі, якія палякі называюць „Крэсы". Дзеля гэтага, мусіць, польскія „радыкальныя" партыі, асабліва „хлопскія", называюць нашу краіну польскім Сібірам. Аб гэтым яны ў сваіх газэтах пішуць даволі часта проста страшныя рэчы. Некаторыя з іх бываюць і праўдзівыя, асабліва, калі ідзе аб тое, дзе яны хочуць здабыць сымпатыю „сібіракоў" — беларусаў.

У апошнім нумары „З. Шг." чытаем мы стацьцю пад загалоўкам «Z polskiej Syberji» вось такога зьместу.

У Браслаўскім павеце, у Богінскай гміне, сяляне маюць сэрвітуты і паводле права імі карыстаюцца. У гэтай справе сяляне ніяк ня могуць зладзіць з абшарнікамі. За абшарнікаў дзяржыць войт Бэйнаровіч, які выражаецца, што трэба дзяржаць сялян у „рызах", каб з іх аж „поліўка лілася". Дворным паслугачом, што не даюць сялянам карыстацца сэрвітутам, памагае так-жа і паліцыя. У вёсцы Авідавічах, пасьля таго, як сялян адведала паліцыя, якая будучы нецьвярозай на пастрах страляла на сэрвітуце, разьюшаныя дворныя лясьнікі злавілі аднаго сялянскага пастуха (было гэта 1 ліпня 1932 г.), зьбілі яго да непрытомнасьці, а пасьля палажылі яго ў мурашнік і там пакінулі. Мурашкі пастуха так скусалі, што той аглох і асьлеп. — У в. Новая Лука на сэрвітутнае пасьбішча прыбыў лясьнічы з лясьнікамі і двума паліцэйскімі і занялі сялянскую скаціну, зьбілі да няпрытомнасьці пастухоў; лясьнічы, езьдзячы конна, здратаваў і пакалечыў безбаронных жанчын, пры гэтым арыштавана 6 сялян.

Аб гэтым мы ў свой час, праўда — не ў такой форме, друкавалі карэспандэнцыю з мейсца. Але-ж гэта яшчэ ня ўсё, што дзеецца ў гэтай польскай Сібіры. Няхай польскія „хлопы", якія так стараюцца на выбарах выманіць ад нашага беларускага сялянства галасы, а прад гэтым ня зусім шчыра памагаюць славамі бядаваць нашаму сялянству, — няхай узглянуць шырэй на нашы беларускія справы і наша жорсткае жыцьцё, ды сапраўды пададуць свой голас у абароне беларускага сялянства.

Асаднікаў сюды насаджываць хто памагаў? — польскія „хлопскія" паслы. Хто, калі чуў, каб у польскім сойме польскі „хлопскі" пасол дамагаўся для беларускага сялянства надзелу зямлі? — ніхто і ніколі. Хто чуў, каб калі польскі «хлопскі» пасол дамагаўся ў Сойме для беларусаў самаўраду, у які-б не назначаліся войты, а выбіраліся большасьцяй галасоў беларускіх? — нідзе, ніхто і ніколі. Ці чуў дзе хто, каб пасол польскіх „хлопаў" дамагаўся для беларусаў роднай школы, або для беларусаў — свайго духавенства? — гэтага ня бывала. А ў нашым краю, які польскія „хлопы" называюць сваім Сібірам, вядзецца змаганьне і на гэтай ніве. Даволі прачытаць у апошніх нумарох „Бел. Крыніцы" караспандэнцыі з Далячанскай парафіі, або карэспандэнцыю зьмешчаную ў гэтым нумары з Іказьні, каб даведацца, што робяць польскія ксяндзы з беларусамі, якіх польскія «хлопы» называюць укосна сваімі „сібіракамі". Аб гэтым польскія „хлопы" маўчаць, як замазаныя, бо тут сходзіцца і іх мэта, да якой імкнуцца і польскія ксяндзы.

Дык змагаймося па ўсім фронце, але фронтам беларускім, каб маглі адказаць, што мы ня Сібір для польскіх „хлопаў" і ня польскія сібіракі; наш край беларускі, а мы — беларусы. Дзеля гэтага належацца нам поўныя правы соцыяльныя і нацыянальныя.

п—к.

Да нас пішуць.

КСЁНДЗ—ПОЛЁНІЗАТАР.

Іказьнь, Браслаўскага пав. Да нашага берагу плывуць толькі кіі ды палкі — кажа беларуская пагаворка.

Неяк па восені прыехаў да нас з Ляндварова ксёндз В. Лобан. Спачатку парахвіяне аднесьліся да яго крытычна. Але кс. Лабан відаць добры полёнізатар, бо сваю работу павёў даволі спрытна.

Адразу паказаўся ён вельмі рупным аб касьцёл. Многія цешыліся, а між імі і я, што маем добрага пробашча. Жыцьцё плыло і мянялася, мяняўся і „рэлігійны“ настрой ксяндзоўскай „працы“, распускаючы калючыя лісты ненавісьці да праваслаўя, а гэта таму, што ўсе праваслаўныя — сьведамыя беларусы. Пачалася атака з боку ксяндза і на ўсё, што ёсьць беларускае.

Забараніў ён з амбоны каталіком заходзіць у царкву пад карай цяжкага грэху. Сьпярша аб беларусах нічога не гаварыў, як-бы няведаючы, што на сьвеце і ёсьць беларускі народ. Але гэта была толькі выдзержка да часу. Дня 15.І. с.г. Іказьненскі гуртом Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры зладзіў беларускае прадстаўленьне ў двары Сьнегах. Тады ксёндз, з мінай чалавека, катораму паказалі надзвычайную рэч, спытаў: „а сконд взелісень ці бялорусіні?“ (А сам — беларус). Ад гэтага часу і пачалася атака на ўсё, што беларускае.

Даведаўшыся, што гуртом Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Іказьні мае ладзіць 5.ІІ. с. г. беларускае прадстаўленьне, ксёндз аж ськіпеў. Перш-наперш, як прыстае „добраму“ агітатару, злаяў ён з амбоны беларусаў і забараніў каталіком прыймаць удзел у беларускім прадстаўленьні. „Прэч з гурткамі“ — крычэў з касьцельнай амбоны ксёндз-агітатар за польшчыну — „жэбы в моей парафіі не было ані еднэго.“

Добра што гуртом не агурок, а то кс. Лобан ня ведама, што з ім зрабіў-бы.

Вечарам таго дня пашла дэлегацыя ад гуртка да кс. Лобана: старшыня Мік. Дварэцкі (праваслаўны), М. Шпак і Ф. Войцілёнак (каталікі), каб даведацца, на якой падставе кс. Лобан забараняе каталіком—беларусам браць удзел у беларускім прадстаўленьні. Пасьля друхгадзіннай спрэчкі высьвілілася, што кс. Лобан прыехаў да нас ня толькі для душпастырскай працы, а галоўна — полёнізаваць беларусаў— каталікоў, а дзе пападуцца пад рукі — і беларусаў праваслаўных.

Прыціснуты, як кажуць, да сьцяны, кс. Лобан прызнаўся сам, што ён полёнізатар і прыехаў да нас, каб зрабіць з беларусаў— каталікоў шчырых палякоў. „Католіцы, а праваслаўні то сон два обозы і бэндзе працоваў жэбы не было помендзы німі лончносьці“ — так цьвердзіць кс. Лобан.

Дык як-жа будзе пашырацца думка аб рэлігійнай лучнасьці сярод праваслаўных беларусаў, калі каталіцкі ксёндз не заве ўсіх да гэнай лучнасьці, а дзяліць жывы народ на два варожыя рэлігійныя лагеры.

Скуткі ўжо ёсьць.

Дня 22.І. с. г. у Іказьні „Стов. Млодзежы Польскей,“ якое называецца ксяндзамі— палякамі „Каталіцкай Акцыяй“, а ў сапраўднасьці зьяўляецца пляцоўкай акцыі польскага *нацыяналізму* і сьцісла партыйнай пляцоўкай польскай *эндэцыі*, ладзіла прадстаўленьне. На прадстаўленьне пайшлі беларусы-каталікі і праваслаўныя. У часе танцаў саламяныя шляхтуны пачалі буяніць (не спадабалася ім, што Ф. Войцілёнак прадэклямаваў беларускі верш) і абзывалі беларусаў хамамі! Чуў я, што за гэта аднаму „шляхтуну“ далі па языку.

Вось плады польска-ксяндзоўскіх агітацыі. Ня мейсца ў нас такім ксяндзом, нам патрэбны ксёндз беларус. Каталік.

РАСКРЫЛІ І ЗАСУДЗІЛІ БАНДУ.

Баранавічы. Доўгі час у Баранавічах дзеяла банда шышоў. Але прышоў час і яе злавілі.

Дзеяла яна сярод рынку і ў белы дзень. Шышы гэтай банды гандлявалі цукеркамі і вымушалі ад дробных гандляроў выкупу, бо ў працілеўным выпадку рабілі ім шкоду. Вымагалі яны ў гэткі спосаб грошы і ад сялян. Доўга цярпелі людзі, але і цярпеньне вычарпалася. Знашлося некалькі разумнейшых і напісалі аб гэтым пракурору. Пракурор загадаў вылавіць шышоў і іх палавілі. Дня 7.І. с. г. адбыўся суд і засудзіў вінаватых у вастрог.

На судзе выявілася, што з гасярод гэтых шышоў, каб лепш замаскавацца, былі і такія, што адначасна служылі канфідэнтамі ў паліцыі („тайнымі“), але суд на гэта не пагледзеў, бо засудзіў і канфідэнта.

Сьцеражэцеся, сяляне, жулікаў і ўмела ды адважна ад іх бараніцеся. К.

НЯМА ДРЭННАГА, КАБ НЯ ВЫЙШЛА НА ДОБРАЕ.

Будслаў. Вялейскага пав. Пасьля сходу, аб скасаваньні бібліятэкі Б. І. Г. і К. у Палесьсі, аб чым ужо пісалася ў № 3 с. г. „Бел. Крыніцы“, пашырылася популярнасьць нашай бібліятэкі, адчуваецца больш наплыў чытачоў. Прыязджаюць і прыходзяць людзі ў бібліятэку: адны адмяняць кніжкі, другія браць, каторыя яшчэ ня бралі. Моладзь і тая стала ахвотней рваціа да роднай кніжкі і беларускай газэты. Перастала браць кніжкі толькі „Коло Млодзежы Вейскай“ у в. Абытацыі. Тут мусіць дасягнула рука пана войта, або вучыцеля-паляка ў Абытацыі. Але гэта таксама выйдзе на добра, бо можа на гэтым урвецца цярпеньне беларусаў, якія, няведама чаму, паўлазілі ў гэнае „кола“

Сусед.

НАША МОЛАДЗЬ БЕЗ СВАЕЙ АРГАНІЗАЦЫІ СЛУЖЫЦЬ ЗА АРЭНУ ДЛЯ ПОЛЁНІЗАЦЫІ.

Валяўка, Навагрудзкага пав. Наша моладзь за часоў „Грамады“ была зарганізаваўшы гуртом гэтай партыі. Нядоўга гэты гуртом быў, бо пасьля арыштаў павадыроў „Грамады“, паліцыя зачыніла і наш гуртом. Закладалі мы і гуртом культурна-прасьветнай арганізацыі Т-ва Беларускае Школы, але і гэты ня ўтрымаўся. Тады нашай моладзяй пачало „апякавацца“ мяйсцовае польскае вучыцельства. Залажылі яны ў нас польскую арганізацыю„Коло Млодзежы Вейскей“ і пры ім завялі спорт. Пачалі ладзіць польскія прадстаўленьні, зьбіралі грошы і рабілі пляны на „шырокон скален“ разбудаваць польскія пляцоўкі. Але ўсё гэта кончылася даўгамі, а з народнага дому выйшаў толькі хлеўчык для сьвіней пана вучыцеля.

Пасьля гэтага ў 1932 годзе, каб пачаць нанова „працу,“ паны вучыцялі пачалі арганізаваць моладзь, каб зладзіць прадстаўленьне. Але, ведаючы сваю „папулярнасьць“ у народзе, яны задумалі прыблізіцца да беларускасьці: запрасілі мяйсцовага студэнта Анішчыка і пачалі арганізаваць прадстаўленьне польска-беларускае. Пад кіраўніцтвам студэнта Анішчыка быў адыграны беларускі сцэнічны твор „На вёсцы.“

На прадстаўленьне, за выняткам 8 асоб паноў, зышлася беларуская моладзь. Сьпярша адыграна было прадстаўленьне польскае, а пасьля — беларускае. Як ігралі беларускае прадстаўленьне, дык на залі так было ціха, што пралёт мухі быў чутны. Прадстаўленьне зрабіла на моладзь вялікае ўражаньне. Пасьля пачаліся скокі. Паны танцавалі ў хаце, а беларуская моладзь на панадворку;— вокны былі адчынены, дык адна музыка грала паном у хаце і „мужыком“ на двары.

Прад прадстаўленьнем было абвешчана, што даход з гэтага прадстаўленьня пойдзе на культурныя патрэбы ў духу польскім і беларускім — папалам. Але як прышлося да дзела, дык з трудам удалося выціснуць на беларускую долю пару грашоў, каб выпісаць некалькі беларускіх газэт.

Пасьля гэтага наша моладзь задумала абыйсьціся без паноў вучыцялёў. У месяцы сьнежні м. г. зарганізавала яна ў Мондзіне гуртом беларускай вясковай моладзі. Не спадабалася і гэта нашым „апякуном“ і пачалі яны афіцыяльна і прыватна недапускаць да „сэпаратызму.“ Так яно і сталася: з арганізацыі нічога ня выйшла, а паны вучыцялі ўзноў „запрашаюць“ нашу моладзь да сябе, але ўжо — ў сьвятліцу.

Дарагая моладзь! Не па дарозе Табе і польская сьвятліца, як збочнае і „Коло Млодзежы Вейскай.“ Закладай свае арганізацыі беларускія: Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, або Т-ва Беларускае Школы. Калі ня ведаеце, як гэта аформіць, зварочвайцеся да цэнтраляў гэтых арганізацыяў у Вільні (можна праз Рэдакцыю „Беларускай Крыніцы“), а яны Вам дарадзяць і памогуць зарганізаваць свой беларускі культурна-прасьветны гуртом. У сваім беларускім гуртку будзеце працаваць без няпрошанай апекі польскіх вучыцялёў, бо кіраваць Вашай працай будуць беларускія культурныя праціўнікі з цэнтраў гэтых арганізацыяў. Дык даволі туляцца і чагосьці баяцца. Ідзеце да працы сьмела і адкрыта.

Макар.

ЗДАРОВЫ ДУХ.

Наш супрацоўнік, С. М. прыслаў у Рэдакцыю рамане няведамага аўтара, які шырока разпаўсюджаны ў Дзісенскім пав. — запісаны ад Г. Бацьвіёнка — З увагі на размер і форму яго зьмясьціць цалком ня можам, а друкуем толькі яго канчатак.

„Пакінь, браце, водку гэту,
Ляпей выпішы газэту.
Калі маеш грошаў лішку,
Ляпей купі сабе кніжку:
Ў дзень сьвяточны пачытай,
Ды „Крыніцу“ пашырай
І дбай аб яе,
Як сам аб сябе.“

Вельмі нас цешыць, што ў нашай моладзі прабуджаецца думка падвышэньня асьветы. Рэдакцыя.

Выясьненьне.

У адказ на карэспандэнцыю з Шаркаўшчыны, зьмешчаную ў № 5 „Бел. Крыніцы“ п. н. „Сам ня гам і другому ня дам“, наша рэдакцыя ад грам. М. Машары атрымала абшырнае пісьмо, якое даволі ярка выясьняе тло, на каторым паўсталі падзеі закранутыя ў успомненай карэспандэнцыі. Пісьма гэтага ў цэласьці, з-за нястачы месца, тут не падаём, але ахвотна пералічаем ягоныя істотныя мясцы. Вось яны:

Грам. М. Машара сьцьвярджае, што: 1. закіды ўспомненай карэспандэнцыі скіраваны супроць ягонай асобы; 2. свае погляды аб Шаркаўскай коопэратыве „Зорка“ выказываў ён не хаваючыся, але проста ў вочы ейным кіраўніком; 3. адмаўляе „Зорцы“ права прыкрывацца імем грамадзка-беларускай установы, называючы яе толькі сапраўднай спэкулянскай супалкай, працуючай да таго за грамадзкі крэдыт; 4. „Зорка“ выгнала з ужытку беларускую мову, замяніўшы яе маскоўскай, а крамнік коопэратывы спатыкае кліентаў расейскімі заклікамі: «пожалуйста, что Вам угодно? что прикажете? чем могу служить?»; 5. „Зорка“ сама ня радзіла грам. М. Машары ўпісвацца ў ейныя сябры і адкланіла ягоную прапазыцыю і помач саргаанізаваньня пры коопэратыве продажы беларускіх кніжак, патрэба якіх у ваколіцы вельмі адчуваецца; 6. „Зорка“ у гэтым годзе мела на продаж толькі 15 беларускіх адрыўных календароў і ніводнага беларускага календара-кніжкі; мела затое на продаж шмат календароў польскіх.

На падставе ўсяго гэтага грам. М. Машара ставіць „Зорцы“ закід неграмадзкасьці і нават небеларускасьці. Пры канцы грам. М. М. ставіць справу „на кант“ і конкрэтна пытае:

„Чаму „Зорка“ за тры гады свайго існаваньня ня выпісала ніводнай беларускай газэты, ніводнай часопісі? На'т такой патрэбнай для пашырэньня чыста коопэратыўных пытаньняў, як „Самапсмач“?

6.ІІ.33.

—§—

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы безстаронна гэтыя тэзы пісьма грам. М. Машары, пакідаем іх вольнай ацэнцы мийсцовых людзей, каторыя ўсю справу з блізка могуць лепш ад нас ацаніць і асудзіць. Ад сябе толькі зазначым, што 1. ў успомненай карэспандэнцыі імя грам. М. Машары ня фігуруе і 2. паводле нашых вестак з рэдакцыі часопісі „Самапомач“, коопэратыва „Зорка“ ў Шаркаўшчыне сапраўды яшчэ ня лічыцца падпішчыкам гэтае вельмі карыснае часопісі для ўсіх беларусоў, а асабліва для беларусоў коопэратараў і гаспадароў.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.